# СКАРГАЎ У СУВЯЗІ З АЖЫЯТАЖАМ НА СУПРАЦЬВІРУСНЫЯ ПРЭПАРАТЫ Ў ГЕНПРАКУРАТУРУ ПАКУЛЬ НЕ ПАСТУПАЛА

**ПРА ДАЎЖЭЗНЫЯ чэргі ў сталічных аптэках і дэфіцыт у апошніх марлевых павязак і арпетолу дзе толькі не гаварылі: і па тэлебачанні, і ў грамадскім транспарце, і ў сталоўцы падчас абедзеннага перапынку... Не абмінуў гэту тэму, адказваючы на пытанні журналістаў, і генеральны пракурор Беларусі Рыгор ВАСІЛЕВІЧ.**

— Я не выключаю, што мы прааналізуем сітуацыю з дэфіцытам лекавых прэпаратаў у сталіцы, — адзначыў Рыгор Васілевіч, — але з ёй, у першую чаргу, павінны разабрацца Міністэрства аховы здароўя і Камітэт дзяржаўнага кантролю. Скаргаў жа ў Генпракуратуру ў сувязі з ажыятажам на супрацьвірусныя прэпараты ў мінскіх аптэках пакуль што не паступала. Калі з'явіцца інфармацыя аб фактах карупцыі з боку прадстаўнікоў фармацэўтычнай галіны, то неадкладна будуць арганізаваны адрасныя пракурорскія праверкі.

Што датычыцца карупцыі наогул, то сёлета за 9 месяцаў выяўлена на 20 працэнтаў больш злачынстваў карупцыйнай накіраванасці, чым за аналагічны перыяд 2008 года. Антылідарамі па-ранейшаму застаюцца сферы будаўніцтва, адукацыі, гандлю, прамысловасці, сельскай гаспадаркі.

**У прыватнасці, Генпракуратура занепакоена заганнай сістэмай «вымагання» ў бацькоў грошай на патрэбы школ, выяўленымі фактамі атрымання хабару за паступленне ў ВНУ, за здачу экзаменаў і залікаў. Толькі за 9 месяцаў у сферы адукацыі зафіксавана 128 фактаў хабарніцтва.**

Але найбольшую небяспеку для грамадства, як паведамілі ў Генеральнай пракуратуры, уяўляе карупцыя ў органах дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, а таксама ў судовых, праваахоўных і кантрольных органах, прадстаўнікі якіх самі павінны супрацьстаяць злачыннасці і карупцыі. За 9 месяцаў службовымі асобамі такіх катэгорый здзейснена адпаведна 592 і 243 карупцыйныя злачынствы.

Паводле слоў Рыгора Васілевіча, маюць месца як сур'ёзныя хабары, дзе гаворка ідзе аб вялікіх сумах грошай, так і дробныя. На хабар памерам у пяцьдзесят ці сто долараў ні ў якім разе нельга заплюшчваць вочы. Адказнасць павінен несці кожны злачынец. Бо калі ёсць дробныя хабары, то, хутчэй за ўсё, недзе паблізу пераходзілі ці пераходзяць з кішэні ў кішэню, з дыпламата ў дыпламат і больш буйныя сумы грошай.

Падчас размовы генеральны пракурор расказаў аб самым, на яго погляд, гучным і сур'ёзным карупцыйным злачынстве за апошні час.

— Крымінальная справа па фактах хабарніцтва пры будаўніцтве і продажы кватэр у Мінску ў найбліжэйшы час будзе перададзена ў суд, — паведаміў Рыгор Васілевіч. — Сярод падазроных па справе — а іх 16 чалавек — службовыя асобы Магілёўскай вобласці і Мінгарвыканкама. Галоўны падазроны — былы намеснік старшыні Бабруйскага гарвыканкама Валяваты — знаходзіцца ў вышуку.

Нагадаю, што былы намеснік старшыні Бабруйскага гарвыканкама падазраецца ў стварэнні злачыннай арганізацыі, якая займалася крадзяжамі грашовых сродкаў бабруйскага прадпрыемства «Камбінат жалезабетонных вырабаў» (усяго скрадзена Br756 млн). А таксама ў атрыманні ад грамадзян больш як 700 тысяч долараў хабару пры размеркаванні жылля ў Мінску. Кватэры прадаваліся людзям па больш высокім кошце, пры гэтым пакупнікі кватэр цалкам усведамлялі незаконнасць таго, што адбываецца, і давалі хабар за «зніжку».

— Валяваты меў праблемы з законам, яшчэ працуючы ў якасці дырэктара Камбіната жалезабетонных вырабаў, — адзначыў Рыгор Васілевіч. — Але, тым не менш, быў прызначаны намеснікам старшыні гарвыканкама. **Гэта сведчыць аб тым, што дагэтуль ёсць недахопы ў падборы кадраў пры прызначэнні на службовыя пасады.**

Сказаў Рыгор Васілевіч і некалькі слоў пра магчымасць увядзення так званай эканамічнай амністыі, якая мае месца ў некаторых замежных краінах.

— Гэта пакуль не больш чым ідэя. Я лічу, што трэба разгледзець замежны досвед: даваць шанц асобам, якія ў мінулым здзейснілі злачынствы эканамічнага характару. Магчыма, мэтазгодна было б замест таго, каб адпраўляць іх на працяглы тэрмін у турму, прымусіць кампенсаваць урон, нанесены дзяржаве, у двух- ці трохразовым памеры. З іншага боку — не заўсёды рацыянальна цалкам вызваляць ад адказнасці злачынца, які кампенсаваў нанесены эканамічны ўрон. Ён павінен адчуць адказнасць. Таму трэба падумаць і выбраць разумны крытэрый вынясення пакарання, каб сапраўды адбіць ахвоту здзяйсняць такога кшталту злачынствы.

**Надзея ДРЫЛА.**

## ТРОЕ ЗАГІНУЛІ, ЧАЦВЁРА ПАЦЯРПЕЛІ

**Такі сумны вынік буйнога дарожна-транспартнага здарэння, якое адбылося паблізу вёскі Туркі Ляхавіцкага раёна, дзе сутыкнуліся мікрааўтобус «Форд» з аўтамабілем «Ровер».**

Як адзначаюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, аварыя здарылася ў выніку таго, што 29-гадовы мінчанін на мікрааўтобусе выехаў на паласу сустрэчнага руху, па якой ехаў аўтамабіль «Ровер» пад кіраваннем вяскоўца з Баранавіцкага раёна. Апошні, а таксама двое пасажыраў легкавушкі загінулі, а кіроўца «Форда» і яшчэ тры пасажыры змешчаныя ў бальніцу. А ў Аршанскім раёне пасля ДТЗ былі шпіталізаваныя пяць пасажыраў, а два чалавекі загінулі на месцы. Як і ў папярэднім выпадку, 41-гадовы кіроўца аўтамабіля «Міцубісі» выехаў на сустрэчную паласу, дзе сутыкнуўся з «Сітраенам». Двое вадзіцеляў і тры пасажыры дзвюх машын у выніку здарэння атрымалі траўмы і трапілі ў бальніцу, а двум пасажырам медыкі ўжо нічым не маглі дапамагчы. У Гродзенскім жа раёне ў нядзелю ў аварыі паблізу вёскі Нецечы пацярпелі дзве сястры — вучаніцы 1 і 7 класаў. 22-гадовы ж кіроўца аўтамабіля «Додж», які выскачыў на сустрэчную паласу і падбіў «Рэно», дзе знаходзіліся дзяўчаткі, загінуў на месцы здарэння.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## РАНІЦАЙ — НАЗАЛЬНЫ ДУШ

Бацькам на заметку



**Удзяцей ніжэйшая рызыка лятальнага выніку ў выпадку захворвання на так званы свіны грып і развіцця такога ўскладнення, як пнеўманія. Найбольшая колькасць памерлых назіраецца, як вядома, сярод моладзі. Ва ўсякім разе, так выглядае сітуацыя ў свеце на сёння.**

Як адзначае **загадчыца кафедры дзіцячых інфекцыйных хвароба ў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па дзіцячых інфекцыйных хваробах Іна ГЕРМАНЕНКА,** трэба апасацца магчымага змешвання віруснай і бактэрыяльнай інфекцыі. Калі вірус трапляе на хранічна хворую насаглотку, бактэрыі, якія там «жывуць», пачынаюць актыўна размнажацца. Такая сітуацыя спрыяе хуткаму развіццю ўскладненняў, у тым ліку пнеўманіі.

Бацькам можна параіць трымацца некалькіх даступных мераў прафілактыкі. Кожную раніцу перад выхадам на вуліцу ачышчаць дзіцяці насавыя хады і рабіць так званы назальны душ — прамываць нос фізіялагічным растворам, які можна набыць у аптэцы. Затым насавыя хады трэба змазаць маззю накшталт аксалінавай ці «Бараментолу». Здаровы нос здольны няблага «блакіраваць» вірусы, якія далей гэтай зоны не пойдуць. Калі ж орган не працуе як след, дзіця пачынае дыхаць ротам, а такім чынам вірус пранікае лёгка і проста.

Каб пазбегнуць самаінфіцыравання, рэкамендуецца асвойваць культуру гігіены: чхаць у сурвэтку і рэгулярна мыць рукі.

З мэтай прафілактыкі можна дапамагчы арганізму з выпрацоўкай такога неабходнага ў супрацьстаянні вірусу грыпу рэчыва, як інтэрферон. Яго ўтрымліваюць лекавыя прэпараты з групы індуктараў інтэрферону. Стымулюючым выпрацоўку інтэрферону дзеяннем валодаюць усё той жа арпетол, грапрынасін, чыя высокая эфектыўнасць была пацверджана як на этапе прафілактыкі, так і ў першыя дні захворвання. Можна прымяняць і анаферон, гамеапатычны сродак інфлюцыд, які ўтрымлівае часціцы раслін, здольных заахвочваць выпрацоўку інтэрферону. Праз насавыя хады дастаўляецца лейкацытарны інтэрферон.

Тэрмінова, у першы дзень узняцця тэмпературы цела, а ў дзяцей гэта — 37,5—38 градусаў на фоне мышачнага болю і характэрнага ламання ў целе і пры адсутнасці катаральнага сіндрому — насмарку і кашалю, неабходна паказацца ўрачу, які прапіша лекавыя дозы належных прэпаратаў. Практычна ва ўсіх хворых з грыпападобнай клінікай бяруцца мазкі з горла і носу. Такім чынам ажыццяўляецца маніторынг вірусаў, якія цыркулююць у краіне.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ РАЗМЕЩЕНИЯ ОБЪЕКТА СТРОИТЕЛЬСТВА

| № лота | Сведения о предмете аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства | | Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений | Условия предоставления земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Адрес земельного участка/ кадастровый номер/ размер/ срок аренды/арендодатель | Целевое назначение земельного участка | | | | |
| 1. | Брестская область, Малоритский район, 0,3 км северо-восточнее д. Луково на озере Луковское/ кадастровый номер 125200000001000445/ площадь 0,9600 га/ срок аренды 50 лет/ арендодатель – Малоритский райисполком, тел. 8(01651) 2 30 17 | для строительства базы отдыха на 18 мест на озере Луковском | Территория участка на 0,29 га покрыта лесом, 0,40 га – пески, 0,27 га – древесно-кустарниковая растительность. Участок расположен в водоохранной зоне и прибрежной полосе оз. Луковского и имеет ограничения в использовании земель: в водоохранной зоне на площади 0,61 га, прибрежной полосе на 0,35 га, санитарно-защитной полосе водоотвода на площади 0,10 га соответственно. Подъезд к участку с автодороги Луково-Заболотье (участок находится в придорожной полосе автодороги Н-745 Луково (от а/д М-12)-Новое Заболотье (4 категория) | - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; заключение победителем аукциона с Малоритским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.<br>Победителю аукциона строительство необходимо осуществлять на условиях:<br>- строительство базы выполнить на расстоянии не менее 50,0 м от бровки земляного полотна автодороги до линии застройки; съезд к застройке выполнить согласно ТКП 45-3.03-19-2006 (02250) «Автомобильные дороги» раздел 6 с устройством покрытия согласно п.6.1.14. (как для главной дороги 4 тех. категории); при необходимости снабжения базы отдыха электричеством и связью строительство воздушной линии электроснабжения выполнить согласно ТКП 45-3.03-19-2006 «Автомобильные дороги» п.6.4., при переходе автодороги учесть дополнительную высоту насыпи 0,5 м и прокладку кабеля связи вдоль дорог производить за пределами полосы отвода на расстоянии не менее 14,0 м от оси а/д 4 категории; в населенных пунктах не менее 1.0 м от наружной бровки кювета, подошвы насыпи дороги или, в случае, когда отсутствует земляное полотно, тротуары – не менее 1,5 м от бортового камня улицы, дороги (укрепленные полосы обочины, кромки проезжей части) (согласно таб.9.1 СНБ 3.03.02-97 «Улицы и дороги городов, поселков и сельских населенных пунктов»), переходы через а/д выполнять закрытым способом с устройством защитного футляра на глубину не менее 1,4 м от верха покрытия проезжей части до верхней образующей футляра; проект в обязательном порядке согласовать с ДРСУ № 179; - места производства работ оградить дорожными знаками и схему их расстановки согласовать с ГАИ Малоритского РОВД;<br>- за три дня до начала работ письменно известить ДРСУ № 179 (г. Малорита, ул. Советская, д. 134, тел./ф. 2 02 71, 2 36 02) о дате начала и окончания работ; после окончания работ в течение 1-го дня привести в порядок придорожную полосу и сдать по акту ДРСУ № 179 | 19 120 220 | 1 912 020 |
| 2. | Брестская область, Пружанский район, на 7 км справа автомобильной дороги Р-101 Пружаны-Береза/ кадастровый номер 125600000001000452/ площадь 0,1298/ срок аренды 20 лет/ арендодатель – Пружанский райисполком, тел. 8(01632) 7 10 93 | для строительства площадки отдыха | Участок покрыт лесом. Установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне подземной кабельной линии электросвязи на площади 0,026 га | - право вырубки древесно-кустарниковой растительности и реализацией древесины, получаемой от вырубки, ГЛУ «Пружанский лесхоз» в установленном порядке; внесение победителем аукциона платы за право заключение договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; заключение победителем аукциона с Пружанским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проектной документации на строительство объекта в срок, не превышающий 2-х лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 2 053 290 | 205 320 |
| 3. | Брестская область, Пинский район, Городищенский с/с,1,1 км юго-западнее дер. Кривичи/ кадастровый номер 125482500001000043/ площадь 0,9993 га/ срок аренды 50 лет/ арендодатель – Пинский райисполком, тел. 8 (01653) 35 38 81 | для создания туристско-этнографического центра юго-западнее дер. Кривичи, (паркинг, сувенирный киоск) | Участок свободен от строений и сооружений и мелиоративных каналов. Подъезд к участку предусматривается по существующей дорожной сети. Установлены ограничения в использовании земельного участка на всей площади в водоохранной зоне и прибрежной полосе реки Припять | - право вырубки древесно-кустарниковой растительности и реализации древесины, получаемой от вырубки, в установленном порядке; внесение победителем аукциона платы за право заключение договора аренды земельного участка; возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; заключение победителем аукциона с арендодателем договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения арендодателем о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2-х лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 27 920 430 | 2 792 040 |
| 4. | Брестская область, г. Пинск, ул. Достоевского, 14/ зем. участок № 1 – кадастровый номер 144500000005000448, площадь 12,8344 га, зем. участок № 2 – кадастровый номер 144500000005000449, площадь 3,4121 га/ общая площадь 16,2465/ срок аренды 99 лет/ арендодатель – Пинский горисполком, тел. 8(01653) 35 38 81 | для строительства транспортно – логистического центра | Участки свободны от строений, сооружений, мелиоративных каналов. Подъезд к участкам предусматривается по существующей уличной сети, также к земельным участкам имеется железнодорожный подъезд. На земельном участке № 1 имеются ограничения в использовании земель напряжением 10кВ на площади 0,6848 га, на земельном участке № 2 в охранной зоне линии электропередачи напряжением 10кВ на площади 0,3360 га, в охранной зоне линии электропередачи напряжением 110 кВт на площади 1,8703 га. | - внесения победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещения победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения; убытков в сумме 6 036 736 рублей, причиненных Пинскому государственному ПЛСХ производства изъятием земельных участков; потерь сельскохозяйственного производства в сумме 51120,8 тыс. руб., вызванных изъятием 7,0637 га сельскохозяйственных земель для использования их в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, и перечисление средств на их возмещение на транзитный счет инспекции управления государственного казначейства по месту регистрации победителя аукциона, код для потерь сельскохозяйственного производства 05201; заключение победителем аукциона с Пинским городским исполнительным комитетом договора аренды земельных участков и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о передаче ему земельных участков государственной регистрации права на земельные участки; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 334 663 560 | 33 466 350 |
| 5. | Брестская область, Столинский район, 110, 650 км автодороги Р-88 Житковичи-Давид-Городок-граница Украины / кадастровый номер 125800000001000072/ площадь 0,0375 га/ срок аренды 50 лет/ арендодатель – Столинский райисполком, тел. 8(01655) 2 26 09 | под строительство объекта придорожного сервиса (пункт питания) | Участок свободен от строений и сооружений. На земельном участке имеются ограничения в использовании земель в охранной зоне линии электропередачи напряжением 110 кВт и водоохранной зоне реки Сырец на площади 0,0375 га | - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; возмещение убытков в сумме 23210 рублей, причиненных ОАО «Горынский агрокомбинат» изъятием земельного участка; заключение победителем аукциона со Столинским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта; осуществления строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; снятие плодородного слоя почвы и использование его для улучшения малопродуктивных земель ОАО «Горынский агрокомбинат» | 116 640 | 11 660 |
| 6. | Брестская область, Ивановский район, Мотольский с/с, 5.2 км северо-западнее дер. Мотоль (восточный берег водохранилища «Жидинье»)/ кадастровый номер 123084505601001120/ площадь 0,6240 га/срок аренды 50 лет/арендодатель – Ивановский райисполком, тел. 8(01652) 2 13 69 | под строительство охотничье-рыболовных домиков на 18 мест | Участок пустует, посадка леса не производилась, граница земельного участка проходит по суходолу. Подъезд к участку будет осуществляться по существующей дорожной сети СПК «Агро-Мотоль». Установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне водохранилища «Жидинье» на площади 0,6240 га | - внесение победителем аукциона платы за право заключение договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; заключение победителем аукциона с Ивановским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Ивановского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 20 062 450 | 2 006 240 |
| 7. | Брестская область, г. Барановичи, ул. Вильчковского, д. 184з в промышленной зоне «Боровцы»/ кадастровый номер 141000000001002430/ площадь 25,0 га/ срок аренды 50 лет/ арендодатель – Барановичский горисполком, тел. 8(01634) 41 31 93 | для строительства логистического центра | Участок свободен от строений. Участок примыкает к шоссе Р-2 Кобрин-Столбцы и железной дороге направлением Лида-Барановичи.13,16 га – пахотные, 2,55 га – под древесно-кустарниковой растительностью, 1,56 га – под болотами низинными, 0,22 га – под водными объектами, 0,96 га – под дорогами, 6,55 га – прочие неиспользуемые земли. На земельном участке имеются ограничения в использовании земель на площади 1,47 га в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи напряжением 10кВ | - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка;возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения; возмещение победителем аукциона потерь сельскохозяйственного производства в сумме 422 612,6 тыс.рублей путем перечисления средств на их возмещение на транзитный счет инспекции Управления государственного казначейства по месту регистрации победителя аукциона, код платежа для потерь сельскохозяйственного производства 05201; заключение победителем аукциона с горисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления не позже чем в 2-месячный срок после принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; права вырубки древесно-кустарниковой растительности; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; по истечении срока аренды земельного участка, совместно с Барановичским горисполкомом, в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования | 253 726 329 | 25 372 630 |
| 8. | Брестская область, Ивацевичский район, 479 (лево) на автодороге Р-43 граница РФ-Кричев-Бобруйск-Ивацевичи/ кадастровый номер 123400000001000747/ площадь 1,4979 га / срок аренды 99 лет/ арендодатель – Ивацевичский районный исполнительный комитет, тел 8(01645) 2 13 69 | под строительство объекта придорожного сервиса (автомобильной заправочной станции, станции технического обслуживания, пункта питания, пункта постоя и охраняемой стоянки) | Участок покрыт лесом. РУП «Белтелеком» на площади 0,0804 га заняты транспортными коммуникациями (подземная кабельная линия связи). Установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне подземной кабельной линии электросвязи и радификации на площади 0,0804 га | - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношения создания земельного участка; возмещение убытков в сумме 7984,03 тыс. руб. причиненных ГЛУ «Барановичский лесхоз» изъятием земельного участка; права вырубки деревьев и реализации древесины ГЛУ «Барановичский лесхоз» в установленном порядке; возмещение победителем аукциона в установленном порядке потерь лесохозяйственного производства в сумме 30412,8 тыс. руб., вызванных изъятием земельного участка площадью 0,6656 га (покрытие лесом) для использования его в целях, не связанных с ведением лесного хозяйства (строительство автозаправочной станции и охраняемой стоянки), перечислив их на транзитный счет инспекции Министерства по налогам и сборам по месту постановки на учет предприятия, код платежа 05202; заключения победителем аукциона с Ивацевичским райисполком договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации прав на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; снятие плодородного слоя почвы и использование его для благоустройства объекта | 78 016 290 | 7 801 620 |

**Повторный аукцион состоится 18 декабря 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524.

Для участия в повторном аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели. Для участия в аукционе необходимо подать заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество», к заявлению на участие в повторном аукционе прилагаются документы:

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 14 декабря 2009 включительно;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Порядок осмотра земельных участков осуществляется на местности по согласованию с арендодателем.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

**Участник, ставший победителем аукциона (претендент), обязан:** подписать протокол аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка победителю аукциона: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения повторного аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

***Заявления на участие в повторном аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням с 11 ноября 2009 г. по 14 декабря 2009 г. включительно.***

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

| Наименование предмета аукциона | Здание детского сада-яслей с сооружениями и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | г. Барановичи, пер. Партизанский 3-й, д. 29 |
| Продавец недвижимого имущества | Концерн «Белнефтехим» (в лице ОАО «Бархим»), тел. 016345 43 18 |
| Сведения о предмете аукциона | Здание 1984 г.п., 2-эт., площадь 3058,2 кв.м, 6 теневых навесов, спортплощадка, мусоросборник, забор, 9 декоративных решеток. Земельный участок площадью 0,9285 га, под размещение многоквартирного жилого дома, объектов торговли, по оказанию услуг населению, административного назначения, срок аренды – 50 лет с последующим продлением. |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 1 054 113 367 |
| Сумма задатка, руб. | 105 411 000 |
| Организатор аукциона | **Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, 20 87 85, 23 12 63, www. brest–region.by** |

Аукцион состоится **11 декабря 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 10.12.2009 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

***Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 10 декабря 2009 года включительно.***

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Местонахождение объекта | г. Сморгонь, ул. Я. Колоса | г. Сморгонь, ул. Советская | г. Сморгонь, ул. Я. Коласа, У-91 | г. Сморгонь, ул. Я. Коласа, У-113 | г. Сморгонь, ул. Я. Колоса, У-83 | г. Сморгонь, ул. Юбилейная, У-55 | г. Сморгонь, ул. Тракторная, У-34А | г. Сморгонь, ул. Тракторная, У-34 |
| Кадастровый номер | 425650100001003506 | 425650100001003742 | 425650100001001013 | 425650100001001010 | 425650100001001012 | 425650100001001009 | 425650100001001015 | 425650100001001008 |
| Площадь участка (га) | 1,5969 | 0,5600 | 0,0899 | 0,0998 | 0,0896 | 0,0900 | 0,1001 | 0,0802 |
| Срок аренды | 30 лет | 50 лет | 50 лет | 50 лет | 50 лет | 50 лет | 50 лет | 50 лет |
| Условия продажи | Строительство торгово-развлекательного центра | Строительство общественно-торгового центра | Строительство торгового объекта | Строительство торгового объекта | Строительство торгового объекта | Строительство торгового объекта | Строительство торгового объекта | Строительство торгового объекта |
| Начальная цена (руб.) | 49 875 798 | 37 771 720 | 15 827 240 | 17 562 970 | 15 775 830 | 15 846 520 | 15 887 210 | 12 729 900 |
| Сумма задатка (руб.) | 4 987 680 | 3 777 170 | 1 582 720 | 1 756 300 | 1 577 580 | 1 584 650 | 1 588 720 | 1 272 990 |

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:**

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3641526001461 в АСБ «Беларусбанк», код банка 504, УНП 500108328, код платежа 04901, получатель платежа – Сморгонский райисполком.

**Гражданин** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (паспорт).

**Индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования.

**Представителям гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность.

**Юридическое лицо** – представителям или уполномоченному должностному лицу юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о гос. регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

**Юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь** – представителю или уполномоченному должностному лицу иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

**Представитель иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Платеж за объект осуществляется единовременно по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь.

**В случае победы расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона возмещает покупатель объекта.**

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

**Аукцион состоится 18 декабря 2009 года в 11.00 по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5 малый зал заседаний.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5, каб. 302 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Телефоны для справок в г. Сморгонь: 8 01592 3 23 41, 3 17 23, 3 23 91.

Заявления принимаются **по 14 декабря 2009 года до 17.00 включительно.**

# БАТЭ і «Дынама» без падазрэнняў, а «Шахцёр» — і без медалёў

## БОЛЬШАСЦЬ КАМАНД ВЫШЭЙШАЙ ЛІГІ ДАКАЗАЛА, ШТО НЕ ГУЛЯЕ ДАМОЎЛЕНЫЯ МАТЧЫ

У нядзелю матчамі 26 тура завяршыўся чэмпіянат краіны ў вышэйшай лізе. БАТЭ, сталічнае «Дынама» і яшчэ некалькі каманд вынікамі даказалі сумленнасць сваёй гульні. Бо менавіта ў апошнім туры вырашалася, хто атрымае бронзавыя медалі (на іх прэтэндавалі магілёўскі «Днепр», салігорскі «Шахцёр», меў шанцы і наваполацкі «Нафтан»). Тры прэтэндэнты былі і на вылет у першую лігу. Калі «Смаргонь» і «Граніт» за некалькі тураў да завяршэння атрымалі туды пуцёўкі, то ў нядзелю вырашалася, хто складзе ім кампанію — «Віцебск», МТЗ-РІПА ці «Гомель».

У тым і феномен сёлетняга беларускага першынства, што пройгрыш 2:5 «Дняпра» сталічным дынамаўцам стаў для магіляўчан бронзавай удачай. Бо канкурэнты магілёўскай каманды таксама прайгралі, нягледзячы на менш сур'ёзных супернікаў. На апошніх хвілінах гледачы матчу ў Мінску паміж «Дынама» і «Дняпром» з напружаннем чакалі фінальнага свістка ў Мікашэвічах — да апошніх хвілін там была нічыя — 1:1. І спадзяваліся, што пройгрыш «Дняпра» мабілізуе сілы салігорскага «Шахцёра», які здолее забіць і, апярэдзіўшы дняпроўцаў, узбярэцца на п'едэстал. Ад бронзы салігорцаў аддзяляў усяго адзін мяч, у той час як магіляўчане павінны былі адыгрываць тры. Некаторыя чакалі нават жэсту ад судзейства — пенальці ў вароты «Граніта» ў дабаўлены час. Аднак на апошняй хвіліне... забіў «Граніт» і выйграў 2:1. Аўтсайдар на развітанне з наймацнейшымі гучна бразнуў дзвярыма, пацешыўшы сваё самалюбства і даказаўшы сумленнасць гульні. Адназначна, на стадыёне ў Мікашэвічах было не так весела, як у Мінску ў гэты момант на «Дынама-Юні». Тут панавала масавая істэрыя — вар'яцеў фанацкі сектар бела-блакітных, якому дзякавала каманда, на супрацьлеглай трыбуне шалёна скакалі прыезджыя балельшчыкі з Магілёва — ім стаў вядомы вынік у Мікашэвічах, і горыч ад пройгрышу 2:5 у гэты вечар была цалкам кампенсаваная фактам заваявання бронзы. Гэта акалічнасць прымусіла мабілізавацца пасля матчу і ахоўнікаў правапарадку — магілёўскіх фанатаў пускалі толькі па маршруце «сектар стадыёна — аўтобус», а машыны з магілёўскім рэгіёнам у нумарах перад стадыёнам выстройвалі ў арганізаваную аўтакалону, якую меркавалася суправаджаць да пункта прызначэння.

Яшчэ больш размоў хадзіла наконт дамоўленых матчаў з прэтэндэнтамі на вылет, якія ўсімі сіламі чапляліся за шанцы застацца ў эліце. Найбольш не пашчасціла «Гомелю» — у апошніх двух турах яго супернікі былі з «групы смерці» — сталічнае «Дынама» і барысаўскі БАТЭ. І ў мінулым туры балельшчыкі падзяліліся на некалькі груп. Першая сцвярджала, што матч паміж «Дынама» і «Гомелем» будзе дамоўленым — віцэчэмпіён, які датэрмінова заваяваў серабро, саступіць. Другія меркавалі, што матч будзе не яўна дамоўленым — «Дынама» засяродзіцца на кубкавых матчах, а на гульню з гамяльчанамі выйдуць пераважна дублёры, абыграць якіх «Гомель» адназначна здолее. Трэція запэўнівалі, што бела-блакітныя заўсёды былі сумленнай камандай і ў брудных закулісных гульнях не заўважаныя. Так і атрымалася: «Дынама» перамагло 2:1, пакінуўшы «Гомель» вырашаць свае праблемы ў апошнім туры. А там яго чакаў чэмпіён БАТЭ. Барысаўчане таксама датэрмінова вырашылі свае задачы ва ўнутраным першынстве і апошнія тры матчы чэмпіянату згулялі ўнічыю. БАТЭ таксама пачалі падазраваць у непрынцыповасці, маўляў, яны і дапамогуць «Гомелю» — зноў згуляюць унічыю. Чэмпіён таксама абверг пустыя плёткі — выйгрыш 3:0, і «Гомель» наступны сезон правядзе ў першай лізе.

Што да астатніх прэтэндэнтаў на вылет, то «Віцебск» і МТЗ-РІПА сустракаліся ў туры паміж сабой і згулялі ўнічыю — 1:1. Заслугоўвае ўвагі і прынцыповасць брэсцкага «Дынама», якое ўпарта не пускала на п'едэстал «Нафтан» — навапалачане саступілі 0:2. Такая непрадказальнасць вынікаў, а таксама той факт, што за чатыры туры да фінішу чэмпіянату на вылет тэарэтычна прэтэндавалі ўсе каманды, пачынаючы з чацвёртай у турнірнай табліцы, сведчаць толькі ў падтрымку скарачэння вышэйшай лігі.

**Вынікове становішча каманд:**

1. БАТЭ — 62 ачкі
2. «Дынама» Мн — 50
3. «Днепр» — 40
4. «Нафтан» — 38
5. «Дынама» Бр — 38
6. «Шахцёр» — 38
7. «Нёман» — 37
8. «Тарпеда» — 37
9. «Мінск» — 36
10. «Віцебск» — 32
11. МТЗ-РІПА — 30
12. «Гомель» — 29
13. «Граніт» — 25
14. «Смаргонь» —15

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# Наша «Палессе» на магілёўскай зямлі

**Напрыканцы мінулага тыдня Бабруйск і Жлобін прымалі чацвёрты «Кубак Палесся». Традыцыйны турнір, сталіцай якога да гэтага года быў Гомель, сустракаў гасцей з пяці нацыянальных зборных па хакеі: Беларусі, Аўстрыі, Даніі, Нарвегіі, Францыі, а таксама каманду Палесся, складзеную ў асноўным з гульцоў хакейных клубаў «Гомель» і «Металург».**

Перадстартавае хваляванне, звязанае з пачаткам падрыхтоўкі нашай нацыянальнай каманды да Алімпіяды ў Ванкуверы, узмацнілася з-за поўнай незразумеласці ў трэнерскай сітуацыі. Сыход Глена Хэнлана ўсяго за сто дзён да галоўных спаборніцтваў чатырохгоддзя паставіў перад беларусамі цяжкае пытанне: хто ж узначаліць зборную ў Канадзе? А пакуль у экстранным парадку выратоўваць становішча быў прызваны Андрэй Гусаў — адзін з трэнераў мінскага «Дынама». Сярод яго падначаленых найлепшыя хакеісты беларускай экстралігі, нашага прадстаўніка ў КХЛ плюс заакіянскія легіянеры Стэфановіч і Гатавец. Усім ім ёсць што даказваць, бо алімпійская заяўка абмежаваная 23 пазіцыямі, а калі ўлічваць амаль «жалезны» статус у тых жа братоў Касціцыных, Грабоўскага, Калюжнага, Кальцова, Антоненкі, Мезіна, то канкурэнцыя яшчэ больш узрастае.

Удзельнікі «Кубка Палесся» былі разбітыя на дзве групы. На «Бабруйск-Арэне» спаборнічалі беларусы, аўстрыйцы і датчане, а ў Жлобіне скрыжавалі клюшкі зборныя Нарвегіі, Францыі і Палесся. Па выніках аднакругавога турніру ў стыкавых гульнях паміж сабой сышліся пераможцы кожнай з груп, каманды, што занялі другія месцы, а таксама трэція.

Першыя два паядынкі ў выкананні каманды Андрэя Гусава склаліся вельмі падобна адзін да аднаго. І рэч не толькі ў аднолькавым ліку — 4:2 — ідэнтычнымі сталіся і сюжэты. Адразу быў зухаваты пачатак, калі ў сетку землякоў і Андэрана, і Моцарта была «адгружаная» абсалютная большасць шайбаў. У чацвер асабліва стараліся абаронцы — галявыя залпы на рахунку Корабава, Усенкі і Антонава. Яшчэ адна прабоіна «аўстрыйскага судна» за Чупрысам (наогул, Яраслаў разам з партнёрамі па тройцы Мялешкам і Задзялёнавым былі галоўнымі запываламі на лёдзе). У суботняй гульні з датчанамі сваё слова сказалі і форварды. Сольным праходам і проста неверагоднай вытрымкай адзначыўся Кулакоў, а потым шайбы правялі маладыя Андрушчанка і Развадоўскі. Але і тут не абышлося без укладу абаронцаў — кідок з далёкай дыстанцыі атрымаўся ў Башко. А вось у канцоўцы абедзвюх гульняў беларусы «збіваліся» на шматлікія выдаленні і дазволілі супернікам трошкі скараціць адставанне.

У паралельнай групе наймацнейшымі сталі нарвежцы, не пакінуўшы ніводнага шанцу французам і «палешукам». З вікінгамі нядзельным вечарам пры аншлагу «Бабруйск-Арэны» колькасцю ў 7000 гледачоў і сышлася зборная Беларусі ў фінале Кубка. Па напружанасці і паказаным камандамі хуткасцям гульня ні ў чым не саступала баталіям чэмпіянату свету. Упершыню за турнір нашы землякі першымі прапусцілі — Торэсэн, за плячыма якога не адзін сезон у НХЛ, выдатна згуляў на дабіванні. Зраўняць лік атрымалася толькі на перадапошняй хвіліне перыяду. Камбінацыю Дзямкова і Развадоўскага замкнуў Жыдкіх. А на пачатку другога Чупрыс паказаў, што не горш за Торэсэна ўмее гуляць на дабіванні. Але развіць поспех і пазбавіць сябе ад нервовай канцоўкі не атрымалася, а нарвежцы на 50-й хвіліне пры колькаснай перавазе аднавілі раўнавагу на табло. Трыбуны пачалі хвалявацца і... яшчэ больш падтрымліваць сваіх. Напэўна, не малая іх роля ў тым, што за 74 секунды да сірэны Андрэй Стась прынёс перамогу, чацвёртую запар, зборнай Беларусі.

У матчы за трэцяе месца Аўстрыя перамагла французаў 5:2, а ў паядынку за 5-ю пазіцыю каманда Палесся не пакінула шанцаў датчанам — 4:2.

**Яўген ВАРАКСА.**

## Як нас дураць

## СЯРОД МАХЛЯРОЎ — БЫЛЫ РАБОТНІК СЕЛЬВЫКАНКАМА

Адразу восем жыхароў Полацкага раёна і Наваполацка будуць судзіць за махлярства і падбухторванне да дачы хабараў.

Як паведаміў «Звяздзе» **начальнік аддзела па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю пракуратуры Віцебскай вобласці Яўген ЛАПКОЎСКІ,** арганізаваная група шляхам злоўжывання даверам грамадзян завалодала маёмасцю і грашовымі сродкамі на агульную суму ў 400 мільёнаў рублёў.

У ходзе следства было вызначана, што жыхар Наваполацка падбухторваў трох грамадзян даць хабар пашпартыстам інтэрнатаў, каб іх туды прапісалі. Абяцаў, што, маўляў, ёсць і магчымасць купіць пакой у інтэрнаце. З гэтай нагоды прыняў ад грамадзян 27 мільёнаў рублёў, якія патраціў на сябе.

Вызначана, што ён на працягу чатырох гадоў «працаваў махляром» разам са сваімі таварышамі.

Механізм таго, як дурылі грамадзян, быў адпрацаваны да дробязяў. Уваходзілі ў давер да адзінокіх, беспрацоўных, тых, хто злоўжываў спіртным, прадавалі іх кватэры ў Полацку і Наваполацку. А былых гаспадароў прапісвалі ў сельскай мясцовасці.

Дапамагаў у гэтым знаёмы сакратар сельскага выканаўчага камітэта — незаконна рэгістраваў пацярпелых у вёсках. А ўласнікі сельскіх дамоў нават і не падазравалі, што ў іх дом нейкіх незнаёмых людзей прапісвалі. Цяпер суд «прапіша» крымінальную васьмёрку там, дзе трэба. І, відаць, надоўга.

## КІРАЎНІЦА АБЯЦАЛА КВАТЭРЫ

Пракуратурай Віцебскай вобласці накіравана ў суд крымінальная справа па абвінавачванні адной з кіраўнікоў камерцыйнай структуры Віцебска. Бізнэс-лэдзі падбухторвала землякоў даваць хабар чыноўнікам, ад якіх залежыць паляпшэнне жыллёвых умоў.

Як паведаміў «Звяздзе» **Яўген ЛАПКОЎСКІ, начальнік аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю**, дзелавая жанчына «агітавала» многіх знаёмых жыхароў абласнога цэнтра за неабходнасць грашовага заахвочвання. Гаварыла, што грошы будуць перададзены работнікам Віцебскага гарвыканкама за пастаноўку на ўлік як асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. Паводле яе абяцанняў, работнікі прадпрыемства «Капітальнае будаўніцтва горада Віцебска» таксама быццам бы маглі за «ўдзячнасці» дапамагчы — уключыць у спісы забудоўшчыкаў і аказаць дапамогу ў афармленні льготных крэдытаў.

Падчас следства вызначылі, што чыноўнікі ніякіх хабараў не прасілі — рабілі за зарплату тое, што пералічана вышэй.

У пракуратуры падлічылі, што махлярка падманула дзевяць грамадзян, якія перадалі ёй 120 мільёнаў рублёў. Нядрэнны заробак! Махлярка ўжо чакае рашэння свайго лёсу за кратамі. Законам за тое, што яна ўчыніла, прадугледжана жорсткае пакаранне — да 10 гадоў пазбаўлення волі. Яшчэ і незаконна зробленыя грошы будзе абавязана вярнуць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


## ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА

**11 декабря 2009 г. проводит аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков под строительство объектов придорожного сервиса**

| № лота | Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка, арендодатель | Характеристика расположенных на участке строений, инженерных коммуникаций | Площадь земельного участка, га | Срок ареды, лет | Назначение участка | Условия продажи | Начальная цена объекта, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Гомельская область, Лельчицкий р-н, Лельчицкий с\с, район автомобильной дороги Р-36 Мозырь – Лельчицы – Милошевичи – граница Украины км 67+680. Кадастровый номер: 322883200001000014. Арендодатель – Лельчицкий районный исполнительный комитет | 0,1120 га лесных земель; 0,0165 га под дорогами и иными транспортными коммуникациями РУП «Белтелеком»; ограничения в использовании 0,1285 га в связи с их расположением в охранной зоне линии связи и водоохранной зоне реки Уборть | 0,1285 | 50 | Строительство пункта питания 2-го уровня сервиса | - осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией; - снятие, сохранение плодородного слоя почвы и использование для благоустройства территории | 247 910 | 20 000 |
| 2. | Гомельская область, Чечерский р-н, на автомобильной дороге Р-38 Буда-Кошелево – Чечерск – Краснополье, 51 км лево. Кадастровый номер: 325600000001000238. Арендодатель – Чечерский районный исполнительный комитет | 0,0160 га – под дорогами и иными транспортными коммуникациями; 0,0877 га – неиспользуемые земли | 0,0988 | 50 | Строительство пункта питания 2-го уровня сервиса | - возмещение убытков РУП автомобильных дорог «Гомельавтодор» в сумме 5 355,7 тыс. руб.; - осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 201 070 | 20 000 |
| 3. | Гомельская область, Октябрьский р-н, северо-западнее д. Малын, на автомобильной дороге Р-34 Осиповичи – Глуск – Озаричи, 87 км. Кадастровый номер: 324000000001000529. Арендодатель – Октябрьский районный исполнительный комитет | 0,0160 га под дорогами и иными транспортными коммуникациями; 0,0612 га лесных земель; ограничения в использовании участка в связи с его расположением в водоохранной зоне реки Птичь вне прибрежной полосы | 0,0772 | 50 | Строительство пункта питания 2-го уровня сервиса | - осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией; - снятие, сохранение плодородного слоя почвы и использование для благоустройства территории | 90 970 | 9 000 |
| 4. | Гомельская область, Хойникский р-н, автомобильная дорога Р-35 Калинковичи – Брагин – Комарин – граница Украины (Комарин) 71 км (право). Кадастровый номер: 325400000001000076. Арендодатель – Хойникский районный исполнительный комитет | Участок свободен от застройки, подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети, ограничений в использовании по охранным зонам нет | 0,0500 | 49 | Строительство пункта питания | - осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией; - снятие, сохранение плодородного слоя почвы и использование для благоустройства территории | 4 790 | 400 |
| 5. | Гомельская область, Добрушский р-н, Кормянский с/с, п. Селище-1 (на автодороге М10 граница РФ (Селище) – Гомель – Кобрин на 13 км, право). Кадастровый номер:321282806601000004. Арендодатель: Добрушский районный исполнительный комитет | Участок неиспользуемых земель, подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети, ограничения в использовании по охранным зонам: 0,0003 га – охранная зона водопровода | 0,2282 | 50 | Строительство охраняемой стоянки | - осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 51 755 | 5 000 |
| 6. | Гомельская область, Светлогорский р-н, северо-западнее д.Боровики, на автодороге Р-82 Октябрьский – Паричи – Речица, 82 км лево. Кадастровый номер:325000000001001745. Арендодатель: Светлогорский районный исполнительный комитет | Участок неиспользуемых земель, ограничения в использовании по охранным зонам: 0,0432 га – охранная зона воздушной линии электропередачи, электрокабеля, кабеля связи | 0,2500 | 25 | Строительство охраняемой автостоянки | - осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 409 070 | 40 000 |
| 7. | Гомельская область, Рогачевский р-н, Довский с/с, автодорога Р-43 граница РФ (Звенчатка) – Кричев – Бобруйск - Ивацевичи (до автомобильной дороги Р-2) на 148 км, лево. Кадастровый номер: 324700000001000559. Арендодатель: Рогачевский районный исполнительный комитет | 0,1766 – участок лесных земель, 0,0032 – под дорогами и иными транспортными коммуникациями РУП «Белтелеком»; ограничения в использовании по охранным зонам: 0,0075 га – охранная зона линии связи | 0,1798 | 50 | Строительство пункта питания | - осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 134 900 | 10 000 |
| 8. | Гомельская область, Калинковичский р-н, г.п. Озаричи, автодорога Р-31 Бобруйск – Мозырь – граница Украины на 97 км+300 лево. Кадастровый номер: 322356000001000526. Арендодатель: Калинковичский районный исполнительный комитет | Участок неиспользуемых земель, ограничений в использовании по охранным зонам нет | 0,1812 | 50 | Строительство пункта питания | - осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 3 232 653 | 300 000 |

1. Аукцион состоится **11 декабря 2009 г.** в 11.30 в здании фонда «Гомельоблимущество» по адресу: г. Гомель, пр. Ленина, 3.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462, с учетом требований Указа Президента Республики от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление установленной формы в фонд «Гомельоблимущество». Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, а также: юридические лица – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельство о государственной регистрации; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации; иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на русский (белорусский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом. При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц предъявляют паспорт.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 по 17.00, последний день приема документов 7 декабря 2009 г. до 17.00 по адресу: г. Гомель, пр. Ленина, 3, каб. 406. Заключительная регистрация участников – 11 декабря 2009 г. с 9.00 до 11.15. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется на счет № 3642927330048 в филиале № 300 Гомельского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомеля, МФО 151501661. Получатель – фонд «Гомельоблимущество», УНП 400243904.

5. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

6. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка по лоту № 1 в сумме 699 298 руб., по лоту № 2 – 763 921 руб., лоту № 3 – 603 631 руб., лоту № 4 – 697 135 руб., лоту № 5 – 688 810 руб., лоту № 6 – 686 655 руб., лоту № 7 – 727 588 руб., лоту № 8 – 596 994 руб. и затраты на подготовку и проведение аукциона согласно смете; внести плату за право заключения договора аренды земельного участка; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка заключить с арендодателем договор аренды земельного участка.

7. Возможность ознакомления с предметом аукциона обеспечивают арендодатели в срок до 7 декабря 2009 года.

8. Организатор открытых торгов вправе отказаться от аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до проведения аукциона.

9. Телефоны организатора аукциона для справок: **8 (0232) 70 14 72, 74 90 27** фонд «Гомельоблимущество», сайт **www.gomel-region.by** и сайт **www.gomelinvest.gov.by**



**Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 20 ноября 2009 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества с понижением начальной цены продажи на 20 %.**

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Баня<br>Забор ж/б панелей 79 $м^2$<br>Мазутная<br>Котельная | 161 240 680 | Могилевская область, Горецкий район, г. Горки, ул. Мира, 20А | 16 124 068 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 31 34 24, 28 41 00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: 20.11.2009 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Информация о земельном участке: площадь земельного участка – 1,3016 га, кадастровый номер – 722050200001006510.

5. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с 3012008900015 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Могилевской области, код 355, УНП 700049607, ОКПО 03454762.

6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 19.11.2009 г.; время: 17.00.

7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

8. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.

9. Извещение о проведении первого открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликовано 15.08.2009 г. в газете «Звязда» № 152.



**Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 20 ноября 2009 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества с понижением начальной цены продажи на 20 %.**

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Забор железобетонный 106 $м^2$<br>Забор железобетонный 88 $м^2$<br>Забор железобетонный 326 $м^2$<br>Забор железобетонный 334 $м^2$<br>Забор железобетонный 239,56 $м^2$<br>Водопроводная сеть<br>Тепловая сеть<br>Канализационная сеть (ливневая)<br>Канализационная сеть (фекальная)<br>Трансформаторная подстанция<br>Кран-балка<br>Административно-бытовой корпус<br>Здание автозаправочной станции<br>Арочник<br>Здание мастерской<br>Асфальтовое покрытие 1123,8 $м^2$<br>Асфальтовое покрытие 3183,5 $м^2$<br>Асфальтовое покрытие 1124,1 $м^2$<br>Асфальтовое покрытие 2719,2 $м^2$<br>Асфальтовое покрытие 258 $м^2$<br>Гараж<br>Емкость 10$м^3$<br>Емкость 10$м^3$<br>Емкость 15$м^3$<br>Емкость 15$м^3$<br>Емкость 15$м^3$<br>Емкость 25$м^3$ | 1 210 830 012 | Могилевская область, Чаусский район, г. Чаусы, ул. Первомайская, 48 | 121 083 001 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 31 34 24, 28 41 00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **20.11.2009 г.** в 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Информация о земельном участке: площадь земельного участка – 2,3312 га, кадастровый номер – 725450100001000000.

5. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с 3012008900015 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Могилевской области, код 355, УНП 700049607, ОКПО 03454762.

6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 19.11.2009 г.; время: 17.00.

7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

8. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.

9. Извещение о проведении первого открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликовано 15.08.2009 г. в газете «Звязда» № 152.



## ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**20 ноября 2009 г. проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение – строительство | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ | Срок аренды, (лет) | Затраты на подготовку документации, бел. рублей | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Микрорайон № 19 | 340100000001003243 | 0,2474 | 18-этажного жилого дома № 55 повышенной комфортности | к землям сельскохозяйственного назначения не относятся | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети | 99 | 923 469 | 100 420 970 | 10 000 000 |
| 2 | ул. Мазурова | 340100000001003288 | 2,7581 | культурно-развлекательного оздоровительного центра «Аквапарк». См. примечание | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона газопровода и водоохранная зона оз. Бурое Болото – 0,0811 га; водоохранная зона оз. Бурое Болото – 1,7335 га; прибрежная полоса оз. Бурое Болото – 0,9435 га | 99 | 2 441 250 | 1 311 733 290 | 130 000 000 |
| 3 | ул. Добрушская | 340100000008001613 | 0,4505 | станции техобслуживания | | участок свободен от застройки. Ограничение в использовании: охранная зона кабеля связи – 0,0168 га; водопровода – 0,0163 га | 50 | 2 532 588 | 29 361 690 | 2 900 000 |
| 4 | ул. Каменщикова – ул. Лепешинского | 340100000002002638 | 0,0847 | магазина-кафе | | земель с ограничением в использовании нет | 50 | 1 214 377 | 29 659 550 | 2 900 000 |
| 5 | ул. Лепешинского – проезд Инженерный | 340100000002002626 | 0,1639 | производственной базы | | ограничение в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением 10 кВ – 0,097 га | 50 | 1 194 160 | 34 296 050 | 3 400 000 |
| 6 | пр-зд Орудийный (участок № 1) | 340100000007004921 | 0,5381 | объектов экологически чистого производства | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,0128 га | 99 | 587 480 | 43 321 770 | 4 300 000 |
| 7 | пр-зд Орудийный (участок № 2) | 340100000007004920 | 0,8016 | объектов экологически чистого производства | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,006 га | 99 | 377 654 | 64 534 460 | 6 400 000 |
| 8 | ул. Текстильная | 340100000003001800 | 0,6789 | здания многофункционального назначения (станция техобслуживания, салон автомобилей, офисный центр, торговый центр с промышленной группой товаров) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона подземной кабельной линии электропередачи – 0,1460 га; охранная зона водовода – 0,0310 га. Выполнить технические условия по выноске КЛ и водовода. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории | 99 | 581 818 | 349 589 290 | 34 900 000 |
| 9 | ул. Ефремова–Сухого | 340100000003001810 | 1,159 | супермаркета с гостевой автостоянкой на 60 машиномест | | участок свободен от застройки. Ограничения в использовании: охранная зона газопровода и водопровода – 0,0052 га; охранная зона кабеля связи – 0,0240 га; охранная зона кабеля связи и канализации – 0,0042 га; охранная зона водопровода и кабеля связи – 0,0353 га; охранная зона канализации – 0,0410 га; охранная зона водопровода – 0,2311 га; охранная зона водопровода и канализации – 0,0225 га | 50 | 1 044 639 | 479 720 390 | 47 900 000 |
| 10 | ул. 60 лет СССР, район жилого дома № 12 | 340100000006003229 | 0,0014 | киоска № 2 | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона р. Сож вне прибрежной полосы – 0,0014 га | 5 | 446 231 | 126 450 | 12 600 |

1.Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2.Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. Аукцион состоится **20 ноября 2009 г. в 14.30** в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

4.1. Представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь представляют доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

4.2. Идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования.

4.3. Представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность.

4.4. Представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

4.5. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители юридических лиц и граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка.

6. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 16 ноября 2009 г.** включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации (каб. № 4).

Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.20 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

**Примечания.** Исключить размещение объектов в прибрежной полосе. Гидроэкологическое обоснование выполнить на стадии разработки проекта.

**Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт – www.gorod.gomel.by.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Сканворд (6 лістапада). Па гарызанталі:** Катамаран. Маяк. Рант. Доказ. Кай. Арап. Адвар. Парк. Самалёт. Атара. Куба. Спас. Ролікі. Згода. Нос. Анан. Лякала. Лях. Гало. Ост. Порт. Фіёрд. Агат. Мур. Арык. Бруна. Аргумент. **Па вертыкалі:** Вадаспад. Канфлікт. Кумыс. Галлё. Проня. Зёлка. Даход. Стан. Кат. Тамара. Абрад. Гуру. Ная. Айва. Акарына. Кон. Кар. Таран. Лом. Доля. Апак. Кіп. Парусіна. Раб. Колер. Лік. Аліса. Талент.

КІРМАШ
адзел рэкламы
287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376
штотыднёвы рэкламны выпуск № 21 (621)

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

*ПРАДАЕЦЦА*

❒ Кватэра 3-пакаёвая, 4 паверх, выдатны рамонт, шклопакеты, вялікая лоджыя, кабельнае ТБ (г. Узда).
Тэл. МТС 772 21 96.

❒ Дом у г. Крычаве, 200 кв. м.
Тэл. 8 029 606 08 78.

❒ 1/3 частка 2-пакаёвай кватэры ў г. Рагачове, танна.
Тэл. 8 029 778 33 38.

❒ Дом у в. Восава Капыльскага раёна, памер 8х11 м, маюцца г/пабудовы, сад, агарод.
Тэл. 8 029 572 26 26.

❒ Кватэра 4-пакаёвая ў г. Клецку з усімі выгодамі.
Тэл. маб. 619 34 52.

❒ Каляска інвалідная ў г. Барысаве.
Тэл. 8 (0177) 74 59 23.

❒ Трактар МТЗ-80 па з/ч, маюцца дакументы.
Тэл. 8 029 782 58 61.

❒ «Аўдзі-80» 1989 г.в., 1,8Б, электрапакет, ABS, ц/замок, сігналізацыя, літыя дыскі, CD-MP3, добры стан, 2950 у.а., торг.
Тэл. 8 029 771 51 78.

❒ «Мазда-323» 1997 г.в., 1,5Б, седан, цёмна-зялёны металік, ц/замок, сігналізацыя, ABS, 2ПБ, электрапакет, гаражнае захоўванне, выдатны стан.
Тэл. 8 029 145 11 97.

❒ Эл. пліта шклокерамічная «Гефест», новая, 50х57 см.
Тэл.: 8 017 295 96 84, 8 029 115 56 99.

❒ Трактар Т-25 1994 г.в., добры стан.
Тэл. 8 029 617 43 67.

❒ Пагрузчык ПГ-02 на трактар Т-16.
Тэл. 8 029 367 25 72.

❒ Кабан, 7 тыс. руб. за 1 кг.
Тэл. 8 029 876 91 27.

❒ Акардэон нямецкі «Хорх» і «Вельтмайстар», поўны, 11 рэгістраў, выдатны стан (г. Навапалацк).
Маб. тэл. 295 62 17.

❒ «Сітраен-Ксантыя» 1996 г.в., 2,1 ТД, у добрым стане, магчымы абмен.
Тэл. 8 029 339 48 85.

❒ Каза тагенбургская, зааненская, козлік зааненскі 8-месячны.
Тэл. 8 01597 73 210.

❒ Бульбакапалка і касілка конныя, акучнік 3-радковы, «бульбазбівалка».
Тэл. 8 029 699 80 87.

*КУПЛЮ*

❒ Аўтамабіль японскай ці нямецкай вытворчасці, можна з дэфектамі.
Тэл. 8 029 145 11 97.

*РОЗНАЕ*

❒ Рэпетытар, рус. мова 5—11 кл., тэсціраванне.
Тэл. МТС 274 93 79.

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя______ №__________ Выдадзены ______________________

Подпіс ______________ Дата ________

# ЖАНЧЫНЫ ДУМАЮЦЬ ПРА СЭКС КОЖНЫЯ 15 ХВІЛІН!

## Вучоныя пракаментавалі 20 самых папулярных навуковых міфаў

***Часопіс Live Science правёў апытанне, каб высветліць, якія міфы карыстаюцца найбольшай папулярнасцю.***

**Пасля таго, як выданне вызначыла спіс, журналісты звярнуліся да вучоных, каб тыя пракаментавалі гэтыя міфы. Большасць выказванняў, як высветлілася, абсалютна беспадстаўныя, але некаторыя — праўда.**

**Вучоныя абверглі папулярную думку пра тое, што мозг чалавека працуе толькі на 10 %.** Як паведамляецца, гэта не так. Вынікі магнітна-рэзанансных даследаванняў мозга наглядна дэманструюць, што большая частка кары галаўнога мозгу актыўна задзейнічана ў жыцці чалавека.

Акрамя таго, **вучоныя абверглі міф аб тым, што ў космасе няма гравітацыі.** Гравітацыя ёсць паўсюдна, сілы прыцяжэння аднолькава ўздзейнічаюць на ўсіх людзей. Касманаўты на арбіце лунаюць у бязважкасці толькі таму, што ўвесь час трапляюць разам са сваім караблём на Зямлю. Толькі робяць яны гэта ў гарызантальнай плоскасці. Гравітацыя змяншаецца з адлегласцю, але цалкам не знікае ніколі.



Вучоныя таксама дадалі, што **памылкай з'яўляецца і сцвярджэнне пра вакуум у космасе.** Насамрэч міжзорная прастора запоўнена разнастайнымі атамамі і часціцамі, проста адлегласць паміж імі крыху большая, чым на Зямлі.

Між тым, паводле слоў даследчыкаў, **мужчыны не думаюць пра сэкс кожныя 7 секунд, як звычайна лічаць.** Думаць аб размнажэнні — гэта закладзены ў прыроду чалавека інстынкт, але навукова праверыць, наколькі часта наведваюць мужчыну такія думкі, немагчыма. Мяркуючы па сацыялагічных даследаваннях, кожныя 7 секунд — гэта ўсё ж перабольшанне.

**Вялікая кітайская сцяна, як высветлілася, — не адзіны аб'ект, створаны рукамі чалавека, бачны з космасу.** У рэальнасці ўбачыць кітайскую сцяну, не ведаючы дакладна, дзе яна знаходзіцца, значна складаней, чым многія іншыя аб'екты на Зямлі.

Разам з тым, паводле слоў вучоных, **курыца можа жыць без галавы**. Гэта тлумачыцца тым, што часам, губляючы галаву, курыца захоўвае стваламую частку мозгу, якая адказвае за большасць рэфлексаў. Вядомы пацверджаны факт, што адна моцная асобіна пражыла без галавы паўтара года.



Праўда, што **есці булачкі з макам — гэта амаль тое ж самае, што і курыць опіум.** Калі праз пэўны час пасля таго, як чалавек з'есць дзве булачкі з макам, узяць у яго кроў на аналіз, тэст на апіяты, хутчэй за ўсё, будзе станоўчым.

Паводле слоў вучоных, сцвярджэнне аб тым, што **манетка, скінутая з хмарачоса, заб'е чалавека, — хлусня.**

А вось **курыным булёнам сапраўды можна вылечыць прастуду.** У ім, як паказваюць даследаванні, утрымліваюцца рэчывы, якія валодаюць супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі, якія дапамагаюць спыніць распаўсюджванне хваробы. «Таму, што б вы ні думалі, мама мела рацыю», — адзначаюць вучоныя.

Калі казаць пра развіццё мозгу ў дарослых, то папулярнае сцвярджэнне пра тое, што **рост клетак мозгу ў дарослых спыняецца, — хлусня.**

Затое словы аб тым, што **пазяханне заразнае, — хутчэй праўда.** Антраполагі мяркуюць, што рэфлекс да паўтарэння позехаў суседа застаўся ў нас ад малпаў. Вядома, што шымпанзэ вельмі любяць передражніваць пазяханне адно аднаго. Гэта значыць, пазяхаючы следам за суседам, мы проста падсвядома перадражніваем яго.



А вось **валасы і пазногці пасля смерці не растуць.** Проста пасля смерці цела чалавека губляе шмат вадкасці, скура высыхае, агольваюцца пазногці, валасы здаюцца даўжэйшымі.

Не раяць вучоныя і параўноўваць рот чалавека і пашчу сабакі. Насамрэч набор бактэрый, якія жывуць у роце ў розных біялагічных відаў, настолькі розны, што параўноўваць проста нельга. **Так што сабака не чысцейшы, ён проста іншы.**

**А калі вырашыце бегчы пад дажджом, то дакладна намокнеце менш.**

**Сцвярджэнне аб тым, што калі нешта падняць на працягу пяці секунд, дык можна лічыць, што яно не падала — абсурдная хлусня, гаворыцца ў артыкуле.** «Гэта настолькі абсурдна, што мала хто ўсур'ёз верыць у гэта, але на ўсялякі выпадак нагадаем, што праведзеныя тэсты паказваюць: шкодныя бактэрыі трапляюць на любы прадмет, які ўпаў на зямлю, адразу ж, пры першым кантакце», — пішуць вучоныя.

Разам з тым, **небяспечнай хлуснёй назвалі аўтары артыкула словы пра тое, што маланка ніколі не трапляе ў адно і тое ж**



**месца двойчы.** Якраз наадварот: напрыклад, у хмарачос Empire State Building у Нью-Ёрку маланка трапляе ў сярэднім 25 разоў на год.

Паводле слоў вучоных, **жывёлы, хутчэй за ўсё, не могуць прадказваць стыхійныя бедствы.**

Таксама **хлусня тое, што змена часоў года адбываецца з-за змянення аддаленасці Зямлі ад Сонца.**

А вось словы пра тое, што **жавальная гумка пераатраўліваецца ў страўніку 7 гадоў — гэта ўжо дарослая хлусня.** Як адзначылі аўтары артыкула, перапрацаваць жавальную гумку некалькі складаней, чым арганічную ежу, але для нашага арганізма няма нічога немагчымага. Так што жавальныя цукеркі дакладна — таксама, як і звычайная ежа — пераатраўліваюцца і выводзяцца з арганізма.

Нагадаем, у ліпені паведамлялася, што, па назіраннях вучоных, насуперак распаўсюджанаму пункту гледжання, **ужыванне піва мала ўплывае на памер жывата**.

Раней паведамлялася, што **ў працоўных абставінах жанчыны думаюць пра сэкс кожныя 15 хвілін**.

# Усходні гараскоп на тыдзень

## Дзевам самы час заняцца творчасцю, а Львы не павінны выпусціць перспектыўны шанц

♈ **АВЕН.** Пажадана ўціхамірыць уяўленне, якое разгулялася, і не звяртаць увагі на безгрунтоўныя чуткі. Усе дасягненні ў гэты перыяд каштоўныя, але іх неўзабаве давядзецца замацоўваць і нават адстойваць. Аўторак і серада на здзіўленне спрыяльныя для пабудовы планаў на перспектыву і канструявання розных праектаў уласнай будучыні. У чацвер варта пацешыцца, калі нічога неспадзяванага не адбудзецца.

♉ **ЦЯЛЕЦ.** Вашым дэвізам на гэтым тыдні можа быць фраза: «Мера ва ўсім». Паспрабуйце не планаваць пачатку новых спраў на гэты перыяд, лепш завяршыць усё няскончанае і даўно адкладзенае. А вось своечасовае праяўленне ініцыятывы на працы прынясе жаданыя вынікі і наступны кар'ерны рост. Прымайце актыўны ўдзел у вырашэнні пытанняў на працы і дома.

♊ **БЛІЗНЯТЫ.** Паспрабуйце не адмаўляць у дапамозе, калі гэта будзе па сілах. Зможаце ўпэўнена рэалізоўваць задуманыя праекты. У ваша распараджэнне можа паступіць важная інфармацыя. У чацвер паспрабуйце прывесці ў парадак грашовыя справы, плануйце будучыню з фінансавага пункту гледжання. Зносіны з сябрамі і аднадумцамі пацешаць вас новымі ідэямі і даляглядамі. Адносіны са сваякамі могуць ускладніцца.

♋ **РАК.** Лепш не пачынаць нічога новага і арыгінальнага. Поспеху падобныя прадпрыемствы мець не будуць, а часу і сілаў адбяруць безліч. Завяршайце пачатае, будуйце планы і ўспрымайце тое, што адбываецца, спакойна. Непажадана пашыраць сферу дзейнасці на працы. Магчымая падтрымка з боку сяброў і заступнікаў. Справы, пачатыя ў суботу, будуць атрымлівацца і пацешаць вас сваімі вынікамі.

♌ **ЛЕЎ.** Ваша інтуіцыя дапаможа спланаваць падзеі найбліжэйшай будучыні, што, несумнеўна, пойдзе на карысць. Зоркі рэкамендуюць не грэбаваць сябрамі. Серада, магчыма, падорыць некалькі шанцаў, адзін больш перспектыўны, чым другі. Калі нельга схапіць усе, ловіце за хвост той, які вас больш за ўсё цікавіць. Не раскрывайце свае сакрэты навакольным, бо вашы словы могуць не так вытлумачыць. У нядзелю сціпласць і элегантнасць будуць вашымі сапраўднымі ўпрыгажэннямі.

♍ **ДЗЕВА.** Шматспадзеўны творчы тыдзень. Але калі жадаеце ўладкавацца на працу, то час не самы спрыяльны. Пачынаючы з аўторка, праявіце ініцыятыву і актыўнасць, вашы ідэі будуць прынятыя і падтрыманыя начальствам і калегамі. У гэты дзень можа паступіць важная інфармацыя — паспрабуйце яе не прапусціць. Паездкі лепш планаваць на пятніцу. У нядзелю верагодная нефармальная сустрэча, ад яе будуць залежаць шматлікія найбліжэйшыя падзеі ў дзелавой сферы. Сітуацыя ў гэты дзень спрыяльная, і поспех практычна гарантаваны.

♎ **ШАЛІ.** Тыдзень пройдзе ў спакойным тэмпе, калі, вядома, вы па ўласнай ініцыятыве не будзеце ствараць сабе лішнія праблемы. Паспрабуйце рэальна разлічваць сілы і не ўзвальваць на сябе лішнюю працу і цяжкія абавязацельствы. Досціп дазволіць убачыць сітуацыю, якая склалася, з іншага боку і знайсці арыгінальны і дзейсны спосаб яе вырашэння.

♏ **СКАРПІЁН.** Час падвядзення вынікаў і пераацэньвання каштоўнасцяў. Паверце ў свае сілы — набліжаецца спрыяльны момант для рэалізацыі вашых задумаў. Сумненні, якія адчуваеце, могуць гнясці, але вы з усім справіцеся і адчуеце жаданую палёгку. Залежнасць ад начальства будзе бянтэжыць, але яе кампенсуюць грашовыя паступленні. У чацвер можаце разлічваць на дапамогу сяброў. Пятніца спрыяльная для плённых сяброўскіх стасункаў.

♐ **СТРАЛЕЦ.** Выдатны перыяд для выканання прац даследчага характару. Надышоў час выкарыстаць сваю дзелавую хватку, падмацаваўшы дзеянні інфармаванасцю і надзейнымі сувязямі. Не перастарайцеся, узяўшы ініцыятыву ў свае рукі і ўсталёўваючы ўласныя правілы гульні: у гэтым выпадку можаце лёгка перайсці межы дазволенага. Аўторак — удалы дзень для запланаваных пераездаў. У чацвер верагодныя рэзкія змены настрою.

♑ **КАЗЯРОГ.** Атрымаецца ярка праявіць сваю індывідуальнасць. Магчымыя асабістыя здзяйсненні — і яны не будуць залежаць ад дапамогі з боку. У сераду знайдзіце час для адзіноты — гэта дазволіць аднавіць сілы, якія вы аддалі працы. Пятніца — удалы дзень для тых, хто вырашыў змяніць працу або прызначыў важныя перамовы.

♒ **ВАДАЛЕЙ.** Мабільнасць і кантактнасць дазволяць справіцца з досыць складанымі праблемамі. Час прыступіць да рэалізацыі творчых задумаў. У аўторак сябры падтрымаюць і дапамогуць. У сераду лепш не прад'яўляць прэтэнзій або патрабаванняў да начальства, бо гэта прывядзе да канфліктнай сітуацыі. Верагодныя знаёмствы з цікавымі і ўплывовымі людзьмі — не выпусціце свой шанец, выкарыстайце гэтую магчымасць. У пятніцу і суботу пажадана паступова завяршаць пачатыя справы, улічваючы нават малаважныя дробязі.

♓ **РЫБЫ.** Тыдзень можа стацца неадназначным, а начальству можа не спадабацца ваша сваволле і занятасць не па справе ў працоўны час. Аўторак і серада прынясуць жаданы поспех. У чацвер не варта планаваць важныя перамовы — вы ўсё адно на іх спозніцеся. Да выхадных у сям'і адновіцца атмасфера даверу і паразумення.

Фота слова. Яўгена Лясецкага

*Там, дзе вясной дурманіў бэз*
*І красавалі даляглядзы,*
*Сумуе сёння зжоўклы лес*
*І восень піша паланэз*
*У мокры сшытак лістапада.*

*Няхай раскажа спеў кароткі*
*Пра цішыню пустой алеі,*
*Туман, лістка абрыс дрыготкі*
*І сем дажджынак, нібы ноткі,*
*На партытуры ліставея.*



# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.27 | 16.19 | 8.52 |
| Віцебск — | 7.22 | 16.04 | 8.42 |
| Магілёў — | 7.17 | 16.09 | 8.52 |
| Гомель — | 7.08 | 16.11 | 9.03 |
| Гродна — | 7.41 | 16.35 | 8.54 |
| Брэст — | 7.37 | 16.41 | 9.04 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 9 лістапада. Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Арсенія, Дзмітрыя, Івана, Максіма.*

***К.*** *Наталлі, Нэлі, Андрэя, Любаміра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## 10 лістапада

**Дзве даты**

**1932 год** — адкрыта першая ў Беларусі транспартная авіялінія Мінск—Глуск—Парычы—Мозыр.

**1970 год** — пачатак асваення Месяца: Савецкі Саюз запусціў навуковую касмічную станцыю «Месяц-17», якая праз тыдзень зрабіла пасадку на паверхні спадарожніка Зямлі ў раёне Мора Дажджоў. На паверхню Месяца выехала першае самаходнае ўстройства «Месяцаход-1», якое кіравалася з Зямлі і падарожнічаў па месяцавай паверхні 11 месяцаў.



**Цытата дня:**

***«Уменне па-майстэрску карыстацца пасрэднымі здольнасцямі не ўнушае павагі, і ўсё ж нярэдка дае людзям больш, чым сапраўды выдатныя якасці».***

**Францува дэ Ларошфуко (1613—1680), французскі пісьменнік-мараліст.**

# Неспрыяльныя дні

Свет і сусвет чалавека

**Фальклорныя і этнаграфічныя крыніцы сведчаць пра тое, што і ў сваёй паўсядзённай працоўнай дзейнасці, і асабліва ў абрадавай практыцы беларусы ўлічвалі адзін немалаважны фактар — неспрыяльныя дні. У кожным месяцы сонечнага года існуе цэлы шэраг так званых «дрэнных» дзён. Прычым розныя крыніцы сведчаць пра тое, што даты неспрыяльных дзён фіксаваныя, устойлівыя, паўтараюцца з года ў год і не залежаць ад таго, звычайны гэта год ці высакосны. Сярод усходніх славян здаўна былі распаўсюджаны спісы, у якіх паказваліся гэтыя нешчаслівыя дні, а часам вызначалася кола абмежаванняў. У народзе такія дні звалі «чорнымі». Паперу, на якой былі запісаны неспрыяльныя дні, скручвалі, нібы старажытныя папірусы, і захоўвалі за абразом у покуці.**

Мы прыводзім табліцу, якая складаецца з розных спісаў, што калісьці існавалі сярод усходніх славян.

Першым падаецца спіс неспрыяльных дзён, запазычаны намі са сшытка, які доўгі час захоўваўся ў хатнім архіве сям'і Н. М. Куцко з вёскі Вулька Аброўская Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Бабуля яшчэ дзяўчынкай перапісвала гэтыя звесткі як «ахоўную грамату» для сябе і сваіх родных.

У гэтым спісе не паказаныя дні мая і снежня. Можна выказаць здагадку, што ўсе дні гэтых месяцаў былі «неспрыяльнымі». Мы ўжо казалі пра тое, што снежань з доўгімі начамі і самым кароткім днём — днём зімовага сонцастаяння, быў «пераходным» месяцам з аднаго года ў іншы. Пра май усё сказала прымаўка: «Май — значыць, маяцца».

У наступным слупку дадзены спіс А. Ю. Лозкі з кнігі «Беларускі народны каляндар»: «На Палессі такія дні яшчэ называюць злымі, нядобрымі, паганымі; яны вядомы і сярод іншых славян»...

У апошнім слупку прыводзіцца спіс народнай сібірскай знахаркі Н. І. Сцяпанавай, якая не раіць у гэтыя нешчаслівыя дні выконваць якія-небудзь важныя справы, распачынаць што-небудзь, прымаць важкія рашэнні.

Зразумела, што ў ранейшыя часы нашы продкі пазбягалі таго, каб пачатак вяселля або хрэсьбінаў, улазінаў супадаў з гэтымі «таямнічымі» днямі.

**Табліца спісаў неспрыяльных дзён**

| Назва месяца | Першы спіс | Другі спіс | Трэці спіс |
|---|---|---|---|
| Студзень | 1, 3, 11, 12, 18, 26 | 1, 11, 12, 18, 26 | 1, 2, 11, 20 |
| Люты | 1, 8, 16, 17 | 2, 16, 18 | 1, 16, 17, 18 |
| Сакавік | 1, 12, 13, 18 | 1, 3, 12, 13 | 1,4, 14, 24 |
| Красавік | 1, 12, 13, 15 | 1, 3, 12, 13 | 3, 11, 18 |
| Май | — | 3, 10, 27, 30 | 7,8 |
| Чэрвень | 12, 17 | 12, 17 | 17, |
| Ліпень | 1, 13, 17, 18 | 15, 18, 30 | 17, 21 |
| Жнівень | 1, 13, 17 | 1, 3, 17 | 20, 21 |
| Верасень | 12, 13, 15, 18, 30 | 15, 18, 30 | 10, 18 |
| Кастрычнік | 11, 15 | 11, 13 | 6, |
| Лістапад | 17 | 1, 7, 17 | 6, 8, |
| Снежань | — | 17 | 6, 11, 18 |

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

# Усміхнемся!

**Поўная перамога феміністак — над уваходам у метро адзінокую літару «М» замяняюць на літару «Ж».**

☺

Масква, ноч, па вуліцы цягнуцца два мядзведзі. Адзін вучыць другога:

— Кансервавую бляшанку лепш выбіраць з мігалкай. Там мяса тлусцейшае.

☺

**— Прыйшла на пляж, у мяне адразу злезла скура. Што рабіць?**

**— Ды што заўгодна! Хочаш — сумачку, хочаш — пальчаткі...**



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 6150. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12